# *§ 22–0. Беларусь у гады Першай сусветнай вайны

МАБІЛІЗАЦЫЯ РЭКВІЗІЦЫІ
АКУПАЦЫЯ БЕЖАНСТВА
СТАЎКА ВЯРХОЎНАГА
ГАЛОЎНАКАМАНДУЮЧАГА
СВЯНЦЯНСКІ ПРАРЫЎ
НАРАЧАНСКАЯ АПЕРАЦЫЯ ЭВАКУАЦЫЯ
БАРАНАВІЦКАЯ АПЕРАЦЫЯ

**1. Ваенныя дзеянні на тэрыторыі Беларусі.** Непасрэдна на тэрыторыі Беларусі ваенныя дзеянні пачаліся ўлетку 1915 г. Але ад самага пачатку Першай сусветнай вайны ў Беларусі была абвешчана *мабілізацыя* ваеннаабавязаных, на яе тэрыторыі былі згуртаваныя расійскія войскі для наступу ва Усходняй Прусіі. У Баранавічах размясцілася Стаўка Вярхоўнага галоўнакамандуючага расійскіх войскаў. Шматлікія тылавыя падраздзяленні, сфарміраваныя ў беларускіх губернях, абслугоўвалі рэгулярныя часці, выстаўленыя для наступу.

**Беларусь напачатку Першай сусветнай вайны**

Успомніце, што такое мабілізацыя.

Наступ расійскіх войскаў у 1914 г. стрымліваўся ў сувязі з рознымі акалічнасцямі — маруднай мабілізацыяй, адсутнасцю зручных дарог і мастоў, аддаленасцю ад баз забеспячэння, ненадзейнай сувяззю паміж штабамі армій і фронту, недахопам зброі і боепрыпасаў і інш.

Як кожны з гэтых фактараў уплываў на гатоўнасць наступу расійскай арміі?

У першым баі на тэрыторыі Усходняй Прусіі пад Гумбіненам у жніўні 1914 г. удзельнічалі мабілізаваныя з беларускіх губерняў. Першапачатковы поспех неўзабаве змяніўся на паражэнне. 1-я і 2-я расійскія арміі ў раёне Мазурскіх азёр (сучасная Польшча) былі разгромленыя германскімі войскамі. Восенню 1914 г. вайсковыя часці, якія напачатку




| | |
|---|---|
| МІНСК | Цэнтры губерняў Расійскай імперыі |
| Орша | Цэнтры паветаў Расійскай імперыі |
| Рэчыца | Іншыя гарады |
| *Лёзна* | Мястэчкі і іншыя населеныя пункты |

ГРАНІЦЫ
- дзяржаў
- губерняў Расійскай імперыі
- сучаснай Рэспублікі Беларусь
- *1 жніўня 1915* Лініі фронту расійскіх войскаў падчас адступлення з тэрыторыі Польшчы і Заходняй Беларусі (з датамі)
- Лінія Заходняга фронту пасля стабілізацыі ў пачатку кастрычніка 1915 г.
- Савецка-германская дэмаркацыйная лінія ў сакавіку 1918 г.

**3А** **9А** Размяшчэнне расійскіх і германскіх армій

НАПРАМКІ НАСТУПУ

расійскіх войскаў — германскіх войскаў
- у 1915 г.
- у 1916 г.
- у 1917 г.

- Наступ германскіх войскаў у лютым 1918 г.
- Дзеянні войскаў Чырвонай арміі пасля Лістападаўскай рэвалюцыі ў Германіі
- Перамяшчэнні германскіх войскаў
- Адступленні і перадыслакацыі расійскіх войскаў

МЕСЦАЗНАХОДЖАННЕ
- Стаўкі Вярхоўнага галоўнакамандуючага Расійскай імперыі
- 3Ф штаба Заходняга фронту
- 2А штабоў расійскіх армій

*Выкарыстоўваючы картасхему, складзіце кароткую гістарычную даведку «Становішча Беларусі ў гады Першай сусветнай вайны».*

вайны змяшчаліся на тэрыторыі Беларусі, прынялі ўдзел у Варшаўска-Івангародскай аперацыі, у выніку якой германскія войскі былі спынены і адкінуты. Але ўжо да канца 1914 г. узнікла пагроза акружэння, і расійскія войскі давялося адвесці. Вайна набыла зацяжны *пазіцыйны характар*.

У 1915 г. саюзнікі па Антанце пераклалі на Расію ўвесь цяжар вайны. Германія, не маючы магчымасці ваяваць на два фронты, свае асноўныя ваенныя сілы перакінула на ўсход. Яна разлічвала, што нанясе Расіі паражэнне, пасля якога тая выйдзе з вайны і Германія зможа нанесці паражэнне англафранцузскім войскам на захадзе. Дзякуючы перавазе

Успомніце, што такое пазіцыйная вайна. Як, на вашу думку, пазіцыйны характар вайны ўплывае на характар баявых дзеянняў, настроі салдат?

## ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ

Першая сусветная вайна колькасцю ахвяр пераўзыходзіла ўсе ранейшыя ваенныя канфлікты. Пачалі прымяняцца і новыя тыпы зброі. У ноч з 19 на 20 чэрвеня 1916 г. у раёне мястэчка Смаргонь германскія войскі здзейснілі першую на тэрыторыі Беларусі газабалонную атаку. Таксама на тэрыторыі Беларусі салдаты расійскай арміі зазналі на сабе не менш варварскую зброю — агнямёты (кастрычнік 1916 г., на поўнач ад Баранавічаў).

*Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, знайдзіце адказы на пытанні:*

1. *Якая колькасць людзей загінула ад прымянення атрутных газаў пад Смаргонню?*
2. *Колькі разам салдат ваюючых бакоў у гады Першай сусветнай вайны пацярпела ад газавых атак?*
3. *Чаму першае прымяненне германскімі войскамі агнямётаў на Усходнім фронце не мела такога ашаламляльнага эфекту, як на Заходнім?*



*Мемарыяльны комплекс памяці герояў і ахвяр Першай сусветнай вайны. Г. Смаргонь*

ва ўзбраенні, добраму забеспячэнню боепрыпасамі і колькаснай перавазе аўстра-германскія войскі здолелі выціснуць расійскія з Польшчы. У пачатку жніўня 1915 г. салдаты Германіі ўвайшлі на тэрыторыю Беларусі.

**1915 г. — ваенныя дзеянні ў Беларусі**

27 жніўня 1915 г. (паводле старога стылю) Германія пачала Віленскую аперацыю. Яе войскі занялі Вілейку і Смаргонь, дасягнулі чыгуначнай лініі Мінск–Смаленск і пашкодзілі пуці ў раёне станцыі Смалявічы. Дзякуючы перакідцы войскаў з іншых франтоў расійская армія здолела ліквідаваць гэты прарыў, які атрымаў назву *Свянцянскага*. Стаўка Вярхоўнага галоўнакамандуючага ў жніўні 1915 г. была перанесена з занятых германскімі войскамі Баранавічаў у Магілёў. У верасні фронт стабілізаваўся па лініі *Дзвінск–Паставы–Смаргонь–Баранавічы–Пінск*. Тэрыторыя Беларусі зрабілася адным з тэатраў ваенных дзеянняў Першай сусветнай вайны.

Прасачыце ход ваенных дзеянняў у Беларусі па картасхеме.

**1916 г.**

У 1916 г., чарговы раз ратуючы саюзнікаў, якія трапілі ў цяжкае становішча пад Вердэнам, Расія

Выкарыстоўваючы картасхему, ахарактарызуйце становішча вашага рэгіёна ў гады Першай сусветнай вайны.




*Тэрыторыя Беларусі, захопленая Германіяй у Першай сусветнай вайне*

паспрабавала правесці наступ у раёне возера Нарач. Неспрыяльныя ўмовы надвор'я, недахоп зброі, дрэннае кіраванне войскамі прывялі да правалу *Нарачанскай аперацыі*. Няўдала завяршылася і *Баранавіцкая аперацыя* ўлетку 1916 г.

1917 г.

Апошні наступ расійскіх войскаў на тэрыторыі Беларусі адбыўся ў ліпені 1917 г. Да гэтага часу сітуацыя ў Расіі кардынальна змянілася. У лютым 1917 г. у ходзе буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі было звергнута самадзяржаўе, усталявалася двоеўладдзе Часовага ўрада і Петраградскага савета рабочых, сялянскіх, салдацкіх дэпутатаў. Да ранейшых прычын, якія пагаршалі баяздольнасць расійскай арміі, дадаліся эканамічны крызіс у краіне, што адбіўся на забеспячэнні фронту, зніжэнне дысцыпліны ў войсках.

Насельніцтва Беларусі на фронце і ў тыле

**2. Насельніцтва Беларусі ў гады Першай сусветнай вайны. Бежанскі рух. Акупацыйны рэжым.** З пачаткам вайны на тэрыторыі Беларусі было ўведзена ваеннае становішча з усімі абмежаваннямі ў грамадска-палітычным жыцці, якія з гэтага вынікалі (былі забаронены забастоўкі, сходы, шэсці, маніфестацыі). Становішча насельніцтва з пачаткам вайны істотна пагоршылася. У расійскую армію былі мабілізаваны каля 900 тыс. жыхароў Беларусі. Мясцовае насельніцтва прыцягвалася для будаўніцтва абарончых збудаванняў. У сялян для вайсковых патрэб

### ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ

Разгледзьце ілюстрацыю і адкажыце на пытанні:

1. *Якія пласты насельніцтва ў асноўным рабіліся бежанцамі ў гады Першай сусветнай вайны? Пацвердзіце свой адказ, выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі.*
2. *Пра што, на ваш погляд, могуць думаць героі фотаздымка? Якія пачуцці выклікаюць яны ў вас?*



*Лагер бежанцаў у г. Слуцк*

## ПРАЦУЕМ З ГІСТАРЫЧНАЙ КРЫНІЦАЙ

Рэквізіцыі даводзілі сялян да поўнай галечы. Так, згодна з загадам германскага камандавання, пасля рэквізіцыі ў сялян Гомельскага павета павінна была заставацца дзённая норма на аднаго жыхара не больш за 225 грамаў хлеба і 300 грамаў бульбы. Ваенная адміністрацыя Койданаўскай воласці Мінскага павета пасля рэквізіцыі пакідала ўсяго 200 грамаў збожжа ў дзень на сям'ю.

*1. Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы, даведайцеся сучасную сутачную норму прадуктаў харчавання для дарослага чалавека.*
*2. Параўнайце атрыманую інфармацыю з прыведзенымі вышэй дадзенымі. Як адбівалася падобнае становішча на здароўі людзей?*

Успомніце, што такое рэквізіцыі, эвакуацыя.

*рэквізаваліся* коні і жывёла, фураж і харчаванне. Заняпад сельскай гаспадаркі прывёў да росту цэн: кошт прадуктаў харчавання і адзення вырас у 1917 г. у параўнанні з 1913 г. у 5–8 разоў.

### Бежанства

Новыя бедствы прынёс германскі наступ 1915 г.: спатрэбілася *эвакуацыя* прадпрыемстваў і дзяржаўных устаноў, якая часцяком праводзілася надзвычай неарганізавана. Войскі, адступаючы, знішчалі сельскагаспадарчыя аб'екты і пасевы, палілі жылыя будынкі. Эвакуацыя суправаджалася велізарным патокам бежанцаў, якія рухаліся на ўсход з тэрыторый Валыні, Польшчы, Літвы, заходняй часткі Беларусі. Сярод іх было шмат хворых, што выклікала распаўсюджванне эпідэмій.

Першапачаткова дзяржаўная дапамога бежанцам не аказвалася, ім дапамагалі толькі добраахвотніцкія і грамадскія арганізацыі: «Усерасійскі земскі саюз», «Усерасійскі саюз гарадоў», «Тацццянінскі камітэт» і інш. Не адразу, але ўсё ж на шляху руху бежанцаў былі арганізаваныя ўрачэбна-харчавальныя пункты і вызначаны месцы для іх размяшчэння. Аднак рэсурсаў для нармальнага забеспячэння людзей жыллём, харчаваннем і работай не хапала.

**Становішча на акупаваных тэрыторыях**

Яшчэ цяжэйшае было становішча насельніцтва ў заходняй частцы Беларусі, акупаванай ад восені 1915 г. Тут была ўсталяваная жорсткая сістэма падаткаў, штрафаў, прымусовых работ. Пастаяннаю з'явай былі рэквізіцыі. Жорстка караліся ўсякія спробы супраціву.

**Выступленні рабочых**

**3. Рабочыя і сялянскія пратэсты.** У сувязі з увядзеннем ваеннага становішча выступленні рабочых і сялян у Беларусі былі надзвычай абмежаваныя. Да таго ж у прыфрантавой паласе былі сканцэнтраваныя войскі, паліцыя, жандары. Удзельнікаў забастовак улады адпраўлялі на фронт. У сувязі з гэтым забастоўкі рабочых Беларусі ў гады Першай сусветнай вайны былі разрозненыя і нешматлікія. Патрабаванні рабочых насілі ў асноўным эканамічны характар. Найбольшую актыўнасць праявілі чыгуначныя рабочыя Гомеля.

**Выступленні сялян**

Своеасаблівую форму ў гады Першай сусветнай вайны набылі сялянскія пратэсты. У асноўным гэта быў стыхійны разгром памешчыцкіх сядзіб, харчовых магазінаў і крам. Колькасць сялянскіх выступленняў паступова зніжалася: у 1915 г. — 99, у 1916 г. — 60, у студзені–лютым 1917 г. — 7.

## ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ

«Усе гэтыя мільёны, якія знаходзяцца ў акопах, могуць сказаць толькі адно: хутчэй мір. Толькі гэта нас можа ўзрадаваць, і мы тады толькі адчуем тую волю і свабоду, якую далі нашы браты, а да таго моманту яна для нас толькі гук і больш нічога».

*З ліста ад 10–14 сакавіка 1917 г.*
*Аўтар невядомы*



*Расійскія салдаты пішуць лісты дадому*

1. *Якія звесткі маглі чытаць салдаты ў лістах, атрыманых ад сваякоў, сям'і ў сакавіку, ліпені, лістападзе 1917 г.?*
2. *Як атрыманыя весткі маглі ўплываць на іх настрой?*
3. *Якім было галоўнае жаданне кожнага салдата, які знаходзіўся на фронце?*

Выступленні салдат

Сацыяльную напружанасць на тэрыторыі Беларусі дапаўнялі хваляванні салдат, выкліканыя дрэнным забеспячэннем харчаваннем і абмундзіраваннем, недахопам зброі і боепрыпасаў. За гады вайны адбылося 62 выступленні салдат у Беларусі. З цягам часу пачасціліся выпадкі дэзерцірства, у 1917 г. ісці ў наступ адмаўляліся цэлыя вайсковыя часці. Армія імкліва траціла баяздольнасць, у тым ліку ў сувязі з антыўрадавай агітацыяй партый сацыялістычнай арыентацыі.

**4. Беларускі нацыянальны рух.** У гады Першай сусветнай вайны ўзмацніўся беларускі нацыянальны рух. Але пачатак вайны быў пазначаны сур'ёзнымі стратамі: праз ціск цэнзуры і недахоп сродкаў былі закрытыя беларускія перыядычныя выданні. У 1915 г. перастала выходзіць «Наша ніва».

Як вы разумееце выраз, што з'явіўся ў асяродку беларускіх бежанцаў: «Як пайшлі ў свет — знайшлі нацыю…»?

Актывізацыі беларускага нацыянальнага руху паспрыяла бежанства. Бежанцы з заходняй часткі Беларусі запоўнілі гарады на ўсходзе, у выніку ў адзін з цэнтраў беларускага адраджэння ператварыўся Мінск. Тут улетку 1915 г. было створана *Беларускае таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны*, дзейнасць якога ў асноўным зводзілася да арганізацыі для людзей начлегу, сталовак, дапамогі ў працаўладкаванні. Гэта была адзіная беларуская арганізацыя, афіцыйна прызнаная ўладамі. Па ўсёй тэрыторыі Беларусі былі створаны яе аддзяленні.

Менавіта ў асяродку бежанцаў паскорылася фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці. Асаблівасці размоўнага маўлення садзейнічалі ўспрыняццю бежанцамі сябе як адметнай нацыянальнай супольнасці, якая ва ўмовах вайны павінна была аб'яднацца для пераадолення эканамічных праблем.

Іншым цэнтрам беларускага нацыянальнага руху быў Петраград, дзе дзейнічала Беларускае таварыства пацярпелых ад вайны, якое выдавала штотыднёвік «Дзянніца».

Успомніце, чаму ўрад Савецкай Расіі быў вымушаны падпісаць умовы Брэсцкага мірнага дагавора.

**5. Брэсцкі мірны дагавор.** Першая сусветная вайна для Расіі скончылася падпісаннем рабаўніцкага **Брэсцкага міру 3 сакавіка 1918 г.**, паводле якога частка тэрыторыі Беларусі была акупаваная германскімі войскамі. Заключэнню дамовы папярэднічалі перагаворы паміж дэлегацыямі Германіі і Савецкай Расіі ў Брэст-Літоўску (снежань 1917 г.) і новы наступ германскіх войскаў на тэрыторыі Беларусі ў лютым 1918 г.

Пры заключэнні міру інтарэсы Беларусі не ўлічваліся. Бальшавікі разглядалі Брэсцкі мір як часовую, тактычную меру і таму пагадзіліся на ўмовы, нявыгадныя ад пачатку. Паводле дамовы тэрыторыя Беларусі дзялілася на некалькі частак. Тэрыторыя на захад ад лініі Дзвінск–Ліда–Пружаны–Брэст-Літоўск адыходзіла да Германіі. Частка Беларусі на поўдзень ад Палескай чыгункі перадавалася Украінскай Народнай Рэспубліцы. Астатнія землі Беларусі разглядаліся як тэрыторыя Савецкай Расіі.

**Акупацыйны рэжым**

На акупаванай тэрыторыі існавалі жорсткая эксплуатацыя насельніцтва, драпежніцкае выкарыстанне вытворчых, сельскагаспадарчых і прыродных рэсурсаў.

Ва ўсіх адміністрацыйных цэнтрах былі размешчаны гарнізоны германскіх войскаў. Рэальнай уладай валодалі германскія каменданты, граданачальнікі, начальнікі паветаў.

**Ануляванне ўмоў Брэсцкага мірнага дагавора**

Рэвалюцыя ў Германіі і ў выніку яе паражэнне ў Першай сусветнай вайне дазволілі савецкаму ўраду 13 лістапада 1918 г. ануляваць умовы Брэсцкага мірнага дагавора. У лютым 1919 г. германскія войскі былі канчаткова выгнаныя з тэрыторыі Беларусі.

**6. Наступствы Першай сусветнай вайны для Беларусі.** Геапалітычнае становішча Беларусі абумовіла суровыя выпрабаванні і бедствы для яе насельніцтва.

| | |
|---|---|
| **Людскія страты** | • Загінула 1,2 млн чалавек.<br>• Больш за 400 тыс. бежанцаў не вярнуліся дадому. |
| **Прамысловасць** | • Эвакуіраваны 432 прадпрыемствы, 139 пераведзены на вытворчасць ваеннай прадукцыі. |
| **Сельская гаспадарка** | • 50 % мужчын мабілізаваныя.<br>• Коні рэквізаваныя для патрэб арміі.<br>• Скараціліся пасяўныя плошчы. |

*Наступствы Першай сусветнай вайны для Беларусі*

## ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ

*З дапамогай дадатковых крыніц інфармацыі падрыхтуйце паведамленне пра аднаго з герояў першай сусветнай вайны — ураджэнца Беларусі.*

*Першая сусветная вайна прынесла велізарныя людскія і матэрыяльныя страты, змяніла палітычную карту свету і Еўропы. Насельніцтва Беларусі ў гады вайны апынулася ў цэнтры ваенных і палітычных падзей. Наступствы для Беларусі былі абумоўлены яе геапалітычным становішчам і падзеямі, якія адбыліся ў 1917 г. у Расіі.*

| **калі ў свеце...** | **на тэрыторыі Беларусі...** |
| --- | --- |
| Сакавік 1916 г. — германская армія часова спыняе атакі на Заходнім фронце каля Вердэна | 9–17 сакавіка 1916 г. — наступ расійскай арміі каля Нарачы (Нарачанская аперацыя) |

**ПЫТАННІ І ЗАДАННІ**

1. Выкарыстоўваючы картасхемы на с. 173 і 175 і тэкст параграфа, складзіце храналагічную табліцу «Ход ваенных дзеянняў на тэрыторыі Беларусі ў гады Першай сусветнай вайны». Якое значэнне мелі ваенныя дзеянні на тэрыторыі Беларусі?
2. Які ўплыў аказалі ваенныя дзеянні на тэрыторыі Беларусі на падзеі на іншых франтах Першай сусветнай вайны?
3. Складзіце тэзісны план адказу на пытанне «Становішча насельніцтва Беларусі ў гады Першай сусветнай вайны».
4. Ахарактарызуйце асаблівасці рабочых, сялянскіх і салдацкіх выступленняў у гады Першай сусветнай вайны на тэрыторыі Беларусі.
5. Які ўплыў аказала бежанства на фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці беларусаў?
6. Якія былі вынікі Першай сусветнай вайны для Беларусі?